17. Черных, П. Я. Историко-этимологический словарь современного русского языка: в 2 т. / П. Я. Черных. – 3-е изд., стереотип. – М.: Рус. яз., 1999. – Т. 2.: Панцирь–Ящур. – 560 с.
18. Duncan-Jones, R. Money and government in the Roman Empire / R. Duncan-Jones. – Cambridge University Press, 1994. – 300 p.

# НАВАГРУДАК – ПЕРШАЯ СТАЛІЦА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. ГЕНЕЗІС ЛЕГЕНДЫ

**В. А. Варонін**

Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, v.varonin@outlook.com

Меркаванне пра тое, што горад Навагрудак быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, мае сёння шырокую папулярнасць на Беларусі. Аднак ёсць усе падставы лічыць, што яна грунтуецца на гістарычнай легендзе. У артыкуле прасочаны працэс яе ўзнікнення і развіцця. Звесткі пра сталічны статус Навагрудка ўпершыню з’явіліся ў беларуска-літоўскім летапісанні ў 20-я гг. XVI ст. У далейшым легенда атрымала развіццё ў гістарычнай літаратуры і замацавалася ў грамадскай свядомасці. У чарговы раз яна была актуалізавана ў канцы XX ст. Нягледзячы на сваю папулярнасць, легенда аж да сённяшняга дня так і не знайшла ніякага сур’ёзнага фактычнага пацвярджэння.

*Ключавыя словы*: Вялікае Княства Літоўскае; Навагрудак; першая сталіца; легендарная сталіца; Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага; Мацей Стрыйкоўскі; беларуская гістарыяграфія.

The opinion that the city of Navahrudak was a first capital of the Grand Duchy of Lithuania today is quite popular in Belarus. However, there is every reason to believe that it is based on a historical legend. The article traces the process of its emergence and development. Information about the capital status of Navahrudak first appeared in the Belarusian-Lithuanian chronicles in the 20s of the 16th century. Further, the legend was developed in historical literature and was entrenched in the public consciousness. It was updated again at the end of the 20th century. Despite its popularity, the legend has not yet found any serious factual confirmation to this day.

*Keywords*: Grand Duchy of Lithuania; Navahrudak; the first capital; the legendary capital; Chronicle of the Grand Duchy of Lithuania and Samogitia; Maciej Stryjkowski; Belarusian historiography.

Думка пра тое, што першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага быў горад Навагрудак (у XIII–XVI стст. Новъгородокъ), сёння вельмі пашырана ў Беларусі. Яна знайшла сваё адлюстраванне у навуковай, навукова-папулярнай, навучальнай і іншай літаратуры. Такую папулярнасць гэтага пераканання няцяжка зразумець. Знаходжанне першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага на тэрыторыі сучаснай Беларусі стала б дадатковым сведчаннем таго, што беларускія землі займалі надзвычай важнае, нават ключавое месца ў гэтай дзяржаве. Але дзякуючы ранейшым даследаванням мы ведаем, што пытанне пра сталічны статус Навагрудка далёка не такое простае. Для пачатку звернемся да гісторыі яго вывучэння.

Трэба сказаць, што праблема мае дастаткова глыбокія гістарыяграфічныя карані. Гісторыкі XIX ст. не ставілі пад сумненне тое, што Навагрудак быў сталіцай Вялікага Княства Літоўскгага. Яшчэ ў канцы XIX – на пачатку XX ст. на гэтай жа пазіцыі стаялі нават тыя аўтары, якія кіраваліся крытычным падыходам у сваіх

даследаваннях. Пра тое, што на пачатковым этапе гісторыі Вялікага Княства Літоўскага яго сталіцай быў Навагрудак, пісалі вельмі аўтарытэтныя вучоныя. У прыватнасці, яе выказваў М. К. Любаўскі. Спачатку ён сцвярджаў гэта прама і цалкам упэўнена [9, с. 3]. Але пазней ён стаў выказвацца ўжо не так катэгарычна, сцвярджаючы толькі, што Навагрудак быў «обычным … местопребыванием” Міндоўга і, з’яўляючыся галоўным горадам Чорнай Русі, разам з усім гэтым рэгіёнам адыграў вельмі вялікую ролю ў станаўленні Вялікага Княства [10, с. 14, 16]. Прыхільнікам тэорыі пра сталічны статус Навагрудка быў яшчэ адзін выдатны расійскі гісторык – А. Я. Праснякоў [16, с. 46]. Ідэю падхапіла маладая беларуская гістарыяграфія. Так, Вацлаў Ластоўскі ў сваёй “Кароткай гісторыі Беларусі” (1910 г.) пісаў: “Калі Міндоўг сеў на вялікакняжэцкім пасадзе ў Новагрудку…” [8, с. 10]. А Усевалад Ігнатоўскі ў “Кароткім нарысе” (1919 г.) ужо прама называў Навагрудак сталіцай Вялікага Княства Літоўскага [6, с. 60]. Але ў далейшым гістарыяграфія адмовілася ад гэтага погляду. Толькі ў канцы 80-х – 90-х гг. XX ст. напаўзабытая легенда нечакана набыла другое жыццё. Гэта адбылося дзякуючы публікацыям беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча [5, с. 59–64; 4, с. 65–71]. А ў хуткім часе сцвярджэнне пра тое, што на раннім этапе існавання Вялікага Княства Літоўскага яго сталіцай быў Навагрудак, стала з’яўляцца і ў іншых усходнеславянскіх гістарыяграфіях: расійскай і украінскай [1, с. 118; 2, с. 394; 17, с. 43].

Пытанне, ці быў Навагрудак у XIII ст. сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, ужо спецыяльна разглядалася ў навуцы. Даследаванне на гэту тэму правёў літоўскі гісторык Томас Баранаўскас. Ён прааналізаваў тагачасныя крыніцы, і ў першую чаргу Іпацеўскі летапіс (ці, дакладней, Галіцка-Валынскі, які ўваходзіць у склад Іпацеўскага), і даў на азначанае пытанне адмоўны адказ [3, с. 39–42]. Аргументацыя даследчыка пераканаўчая, з яго падагульняючым меркаваннем таксама можна пагадзіцца. Аднак Т. Баранаўскас не абмежаваўся толькі факталагічным бокам справы, ён таксама зрабіў спробу даследаваць фарміраванне “міфа” пра сталічнасць Навагрудка – але, як падаецца, з істотнымі недахопамі. Так, напрыклад, ён палічыў, што першыя звесткі пра яго з’явіліся ў Хроніцы Быхаўца. Як будзе паказана ніжэй, гэта не зусім адпавядае рэчаіснасці.

Такім чынам, ёсць патрэба спецыяльна звярнуцца да высвятлення таго, як узнікла, набыла папулярнасць і эвалюцыянавала “слаўная легенда” пра Навагрудак як першую сталіцу. Гэта невялікае даследаванне з галіны гісторычнай міфалогіі мы таксама пачнём з высвятлення фактаў. А яно прыводзіць да высновы, што ніякія раннія (XIII–XV стст.) гістарычныя крыніцы не ўтрымліваюць ніякіх выразных указанняў на тое, што Навагрудак быў сталіцай Вялікага Княства Літоўскага – першай ці якой бы там ні было. Выключэннем з’яўляецца хіба толькі прыпіска да Іпацеўскага летапіса, якая ў розных копіях мае дзве розныя даты: 1305 ці 1315 год. У ёй гаворыцца: «Нача княжети Кгедиминъ Витуновичь въ Литве, въ Новгородку и Кернове…” [11, с. 227]. Але гэта паведамленне, безумоўна, мае позняе паходжанне і не выклікае даверу.

Нельга нават сцвярджаць, што Навагрудак калі-небудзь меў нейкі адметны адміністрацыйны статус у Вялікім Княстве Літоўскім. Тут на памяць прыходзяць хіба толькі некаторыя факты з царкоўнай гісторыі. Лічыцца, што прыблізна ў 1317–1330 гг. у Навагрудку знаходзіўся цэнтр т. зв. Літоўскай праваслаўнай мітраполіі. Але гэта не можа быць доказам таго, што ён меў сталічны альбо нейкі іншы адметны дзяржаўна-адміністрацыйны статус. Па-першае, усё ж не існуе бясспрэчных доказаў таго, што сталіца Літоўскай мітраполіі знаходзілася ў той час менавіта ў Навагрудку. Гэта ўсяго толькі дапушчэнне, хоць і дастаткова

праўдападобнае. Па-другое, калі нават гэта было і так, рэзідэнцыя вышэйшага царкоўнага іерарха неабавязкова павінна была знаходзіцца ў сталіцы дзяржавы – асабліва з улікам таго, што вялікія князі літоўскія ў той час былі язычнікамі.

Самыя раннія звесткі пра тое, што Навагрудак быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, мы знаходзім у адным з праграмных твораў беларуска-літоўскага летапісання – Хроніцы Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага. Гэта Хроніка (далей – ХВКЛЖ) стварыла новую версію ранняй гісторыі літоўскага народа і Вялікага Княства Літоўскага, якое прадстаўлена ў ёй як яго дзяржава. Гэта версія носіць выразна літаратурны характар. Яна ўяўляе сабой комплекс легенд, якія распавядаюць пра асноўныя этапы станаўлення Вялікага Княства: ад вандроўкі продкаў літоўцаў з Італіі да берагоў Балтыйскага мора да заснавання Гедымінам яго новай сталіцы – Вільні. Як высветліў Ежы Ахманьскі, Хроніка была складзена ў 20-я гг. XVI ст. [19, s. 159]. Трэба сказаць, што ў той перыяд у Вялікім Княстве Літоўскім з’явілася вострая патрэба ў стварэнні новай гісторыі краіны, якая б сягала самых старажытных часоў. Яна была выклікана перш за ўсё тым, што адзіная пісаная гісторыя Вялікага Княства, якая існавала на той час, пачыналася толькі з эпохі Гедыміна. А гэта рабіла Вялікае Княства Літоўскае нашмат маладзейшым за яго галоўных замежных палітычных і ваенных канкурэнтаў – Польскае каралеўства і Маскоўска-Рускую дзяржаву. Старажытнае мінулае ў той час моцна павышала аўтарытэт краіны ды і само яе права на дзяржаўнае існаванне.

У перыяд Сярэднявечча і ранняга Новага часу многія народы Еўропы, і ў першую чаргу тыя з іх, якія мелі ўласную дзяржаўнасць, займелі свае пісаныя гісторыі. Пачатковыя часткі практычна ўсіх гэтых хронік і летапісаў носяць легендарны характар. Сэнс і ідэйная накіраванасць гэтых легенд таксама зразумелыя – яны былі павінны стварыць вобраз як мага больш старажытнай і як мага больш слаўнай айчыннай мінуўшчыны. Усе тэксты гэтага кшталту ўтрымліваюць некалькі абавязковых элементаў, якія асвятляюць важнейшыя, з пункту гледжання тагачаснага інтэлектуала і дзяржаўнага дзеяча, моманты гісторыі таго ці іншага народа. Да іх ліку належаць: яго паходжанне (этнагенетычная легенда), узнікненне ў яго дзяржавы (у тым ліку заснаванне сталіцы, вынаходжанне дзяржаўнага герба і інш.), паходжанне кіраўнічай дынастыі. Усе гэтыя сюжэты абмяркоўваліся ў гуртках інтэлектуалаў, а потым знаходзілі сваё гісторыка-літаратурнае афармленне пад пяром некага з іх. Як правіла, гэтыя людзі былі звязаны, а часам проста знаходзіліся на службе ў прадстаўнікоў дзяржаўна-палітычнай эліты, якія былі зацікаўлены ў стварэнні ідэалагічнага падмурка існавання той краіны, якой кіравалі. Легендарныя аповесці, якія былі складзены з такой мэтай, у большасці выпадкаў не мелі пад сабой ніякай гістарычнай асновы. Яны выконвалі зусім іншую функцыю – а менавіта, павінны былі даць выразныя і зразумелыя адказы на пералічаныя вышэй пытанні, важныя з пункту гледжання дзяржаўных інтарэсаў. Версія пра тое, што Навагрудак быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, цалкам адпавядае названаму напрамку развіцця гістарычнага пісьменства.

Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага стала базавым творам другога зводу беларуска-літоўскага летапісання. Яна ўвайшла ў склад шасці помнікаў гэтай групы: летапісаў Археалагічнага таварыства, Красінскага і Рачынскага, а таксама Альшэўскага, Румянцаўскага і Еўраінаўскага летапісаў. Пазней ХВКЛЖ была ўключана таксама ў трэці звод беларуска-літоўскага летапісання, які прадстаўлены Хронікай Быхаўца і нядаўна адкрытым Вавельскім летапісам. Дзякуючы такой колькасці твораў легенда пра тое, што Навагрудак быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, стала шырока вядомай.

У сваім пачатковым выглядзе яна выглядае наступным чынам. Даведаўшыся пра тое, што хан Батый разграміў і спустошыў Рускую зямлю, вялікі князь жамойцкі Мантвіл адправіў туды свайго сына Скірмонта (варыянт: Ердзівіла) з войскам і трыма "раднымі панамі". Яны перайшлі рэкі Вілію і Нёман, знайшлі за чатыры мілі ад Нёмана "гору красную" і заснавалі на ёй горад, якому было нададзена імя *Новъгородокъ*. «И вчинил собе князь великии в нем столець и назвался князем великим новъгородским». Пасля смерці Мантвіла тут стаў княжыць ужо сам Скірмонт. Імёны князёў і ход падзей у розных летапісах адрозніваюцца паміж сабой. Але самая пашыраная версія даводзіць, што пасля смерці старэйшага брата, які панаваў у Жамойці пасля свайго бацькі Мантвіла, навагрудскі князь (Скірмонт ці Ердзівіл) завалодаў «обема тыми княженьи, Литвою и Жомоитью» [14, с. 91, 129–130, 146–147, 174–175, 194–195, 215–216; 13, с. 130–131]. Адметнай рысай легендарнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, якая выкладзена ў ХВКЛЖ, трэба лічыць ідэю аб тым, што ў гэтай дзяржаве паслядоўна змянілася некалькі сталіц. Першай з іх быў Навагрудак, а наступнымі сталі Кернава, Трокі (ці, дакладней, Старыя Трокі) і, нарэшце, Вільня.

Абсалютная большасць даследчыкаў пагаджаецца з думкай, што натхняльнікам стварэння ХВКЛЖ быў Альбрэхт Гаштаўт, у 1522–1539 гг. віленскі ваявода і канцлер Вялікага Княства Літоўскага. Пра гэта выразна сведчыць цэлы шэраг фактаў, якія ўжо так ці інакш адзначаліся ў літаратуры. Сярод менш вядомых адзначым тую акалічнасць, што Крупмі, першы з "радных паноў" князя Скірмонта, прадстаўлены ў легендзе пачынальнікам рода Гаштаўтаў – «и с Крумпя народился Кгаштовт».

Але навошта А. Гаштаўту спатрэбілася рабіць Навагрудак першай сталіцай дзяржавы? Тут варта ўспомніць, што магнат меў шчыльныя сувязі з гэтым горадам – нейкі час быў тамтэйшым ваяводам. Але, як падаецца, яшчэ большую ролю тут адыграла іншая акалічнасць. У снежні 1522 г., у знак удзячнасці за ўмоўнае (на выпадак сваёй смерці) абранне сына, каралевіча Жыгімонта Аўгуста вялікім князем літоўскім, кароль Жыгімонт I шчодра ўзнагародзіў Альбрэхта Гаштаўта, які, відаць, непасрэдна і займаўся падрыхтоўкай гэтай справы. Яго сын Станіслаў – на той момант, відаць, яшчэ непаўналетні – быў намінаваны на пасаду навагрудскага ваяводы. Праўда, гаспадарскі прывілей прадугледжваў, што ён зможа заняць яе толькі пасля смерці альбо пераводу на вышэйшую пасаду дзеючага ваяводы Яна Забярэзінскага [20, s. 400–401]. Але гэта не мяняла сутнасці той справы, якая з'яўляецца прадметам нашага разгляду. Па ўсёй бачнасці, складальнік ХВКЛЖ прадставіў Навагрудак першай сталіцай дзяржавы на жаданне А. Гаштаўта, які такім спосабам вырашыў узняць прэстыж пасады свайго адзінага сына.

Трэба ўвогуле сказаць, што Гаштаўты так ці інакш былі звязаны з усімі чатырма сталіцамі ВКЛ – рэальнымі і ўяўнымі. Навагрудскімі намеснікамі (ці ваяводамі, як яны пачалі сябе называць з 1507 г.) у 2-й палове XV – 1-й палове XVI стст. былі прадстаўнікі трох пакаленняў гэтага роду: Марцін, Альбрэхт і Станіслаў. Троцкімі ваяводамі былі ў свой час Ян Гаштаўт, яго сын Марцін, а потым і сам Альбрэхт Марцінавіч. Стаў ім незадоўга да сваёй смерці і апошні прадстаўнік роду – Станіслаў. Віленскімі ваяводамі былі Ян і Альбрэхт Гаштаўты. Кернава, некалі сапраўды буйное гарадское паселішча, а ў XVI ст. усяго толькі невялікае сяло, было адным са шматлікіх уладанняў Альбрэхта Гаштаўта.

У Хроніцы Быхаўца легенда пра Навагрудак выкладзена ў цэлым так жа, як і ў ХВКЛЖ [13, с. 130–132]. Але яна мае тут і некаторыя новыя рысы. Так, у ХВКЛЖ важная для нашай тэмы постаць Міндоўга згадана ўсяго адзін раз, прычым у другарадным сюжэце – ён выступае там як бацька "вялікага князя гальшанскага"

Альгімонта [14, с. 96, 153, 180, 200, 221]. Аналагічнае паведамленне мы знаходзім і ў Хроніцы Быхаўца, але Міндоўг згаданы там яшчэ некалькі разоў. Напрыклад, ён фігуруе як сын Рынгольта, вялікага князя літоўскага – зразумела, легендарнага, як і вялікі князь гальшанскі Альгімонт. Згодна з Хронікай, Міндоўг атрымаў усе свае ўладанні менавіта ад Рынгольта – "и пануючы великому князю Миндовгу на Новогородцы и на руских городах". Стваральнік Хронікі Быхаўца даведаўся пра рэальнага Міндоўга і факты з яго біяграфіі непасрэдна з Галіцка-Валынскага летапіса, бо быў добра знаёмы з гэтым помнікам і актыўна выкарыстоўваў яго ў сваім сачыненні [7, с. 177].

Наступны крок у разбудове легенды зрабіў Мацей Стрыйкоўскі. У сваёй славутай "Хроніцы польскай літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі" ён выклаў гісторыю заснавання Навагрудка ў адпаведнасці з беларуска-літоўскімі летапісамі – а дакладней, з той яе рэдакцыяй, якая прадстаўлена ў Хроніцы Быхаўца. Тут неабходна заўважыць, што М. Стрыйкоўскі добра ведаў трэці звод беларуска-літоўскага летапісання. Праўда, пераказваючы летапісныя тэксты, ён дапоўніў сваё апавяданне і шматлікімі дадатковымі звесткамі [21, s. 235–237]. Праўда, гэтыя звесткі не маюць ніякай гістарычнай асновы, і іх трэба кваліфікаваць не іначай як літаратурныя ўпрыгожанні. Сярод іх прыгадаем, напрыклад, арыгінальныя тытулы Ердзівіла Мантвілавіча – "спадкаемец Жамойцкай і Літоўскай зямлі, першы вялікі князь рускі навагрудскі", "князь літоўскі і рускі навагрудскі" ды падобныя [21, s. 235, 244]. Зразумела, што яны не знаходзяць ніякіх адпаведнікаў у гістарычных крыніцах эпохі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. М. Стрыйкоўскі першым паведаміў пра тое, што, прыняўшы ў 1252 г. каталіцкае хрышчэнне, Міндоўг праз нейкі час быў каранаваны папскім легатам у Навагрудку [21, s. 288, 289]. Логіка храніста была, відаць, такой: раз сталіцай Міндоўга быў Навагрудак, значыць, яго хрышчэнне і каранацыя павінны былі адбывацца менавіта ў гэтым горадзе. Хроніка М. Стрыйкоўскага выйшла друкам у 1582 г. і хутка набыла шырокую папулярнасць і вялікі аўтарытэт у чытачоў. Вельмі доўгі час яна моцна ўплывала і нават фарміравала грамадскія і навуковыя веды пра гісторыю Вялікага Княства Літоўскага. І дзякуючы ў першую чаргу хроніцы Стрыйкоўскага адбылося шырокае распаўсюджанне легенды пра колішнюю сталічную ролю Навагрудка і яе замацаванне ў свядомасці адукаванай публікі. Адсюль яна перайшла ў многія іншыя творы: друкаваныя і рукапісныя. З друкаваных адзначым "Хроніку Еўрапейскай Сарматыі" Аляксандра Гваньіні (1611 г.), якая таксама мела вялікі чытацкі поспех [18, s. 7].

Прыкладна такую самую версію легенды пра Навагрудак, што і ў Стрыйкоўскага, мы чытаем у Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай – фактычна чацвёртым, апошнім агульнадзяржаўным летапісным зводзе Вялікага Княства Літоўскага. Гэты помнік быў складзены ў XVII ст. і мае кампілятыўны характар. Аўтар хронікі ідзе за М. Стрыйкоўскім і сцвярджае, што да татарскага нашэсця Навагрудак быў сталіцай "княжати руского", але быў разбураны Батыем. І толькі праз нейкі час Ердвіл (Радзівіл), сын жамойцкага князя Мантвіла, заснаваў на гэтым месцы новы замак. Хроніка выразна змяшчае Навагрудак на Русі і называе дакладную дату яго пабудовы – 1258 год [13, с. 18–19]. Як і твор М. Стрыйкоўскага, Хроніка Літоўская і Жамойцкая паведамляе пра прыняцце Міндоўгам "рымскай веры" і пра яго каранацыю каралеўскай каронай. Але па нейкіх прычынах яна ўжо не ўказвае месца гэтай каранацыі [13, с. 26–27].

Прыкметнае значэнне для развіцця і пашырэння легенды мелі працы, бадай, самага вядомага гісторыка Вялікага Княства Літоўскага XVII ст. А. Віюка-Каяловіча. Яго лацінамоўная "Літоўская гісторыя" таксама была кампіляцыяй,

прычым зарыентаванай на замежнага чытача. Яна абапіралася ў асноўным на хроніку М. Стрыйкоўскага. Тым не менш, аўтар занатаваў у ёй і некалькі арыгінальных звестак, якія з'яўляюцца важнымі для нашай тэмы. Так, напрыклад, ён паведаміў, што Міндоўг быў ахрышчаны разам з шасцюстамі сваімі набліжанымі і што ўрачыстая цырымонія яго каранацыі прайшла "на навагрудскіх палях", бо ў самім горадзе не знайшлося ніводнага дастаткова вялікага збудавання, у якім можна было б правесці гэта мерапрыемства [22, p. 97].

У значнай ступені новае асвятленне разгляданы сюжэт атрымаў у Густынскім летапісе. Пад 1246 г. ён паведамляе, што вялікі князь літоўскі Міндоўг «приять веру христианскую от Востока со многими своими бояры». А ў 1252 г. ён быў каранаваны «на кролевство Литовъское въ Новогродку за благословениемъ папы Инокентия през Генърика, бискупа хелмского (въ Прусехъ), каръдинала папежского» [15, с. 121–122]. Калі крыніцу другога паведамлення мы лёгка распазнаём ў хроніцы М. Стрыйкоўскага, дык першая звестка чытаецца толькі ў Густынскім летапісе.

Для таго, каб больш прадметна меркаваць пра яе паходжанне, варта уважлівей прыглядзецца да самой крыніцы. У Густынскім летапісе выкладзены падзеі «от потопу первого мира и столпотворения" і да 1597 г. Самая ранняя копія, якая дайшла да нас, была перапісана ў 1670 г. у праваслаўным Траецкім Густынскім манастыры на Палтаўшчыне. Твор мае вельмі выразную праправаслаўную скіраванасць і ўсяляк абараняе гістарычныя правы і інтарэсы Праваслаўнай царквы і яе вернікаў. Як і некаторыя іншыя, названыя вышэй творы, паводле свайго характару Густынскі летапіс з'яўляецца кампіляцыяй. Самыя шчодрыя запазычанні ў ім паходзяць са старажытнарускіх зводаў, а для пазнейшага перыяду – з польскай храністыкі, у большасці ўжо друкаванай.

Падставай для ідэі Густынскага летапіса пра тое, што Міндоўг прыняў праваслаўнае хрышчэнне як быццам у Навагрудку, сталі, па ўсёй бачнасці, факты, якія занатаваны ў Галіцка-Валынскім летапісе. Складальнікі Густынскага летапіса добра ведалі гэты помнік і карысталіся, па ўсёй бачнасці, яго Хлебнікаўскім ці падобным спісам [15, с. 3]. У Галіцка-Валынскім жа летапісе сказана, што Войшалк, сын Міндоўга, "крестися тоу в Новегородьце и нача быти во крестьяньстве" [12, стб. 858–859]. Пры гэтым трэба памятаць, што ў больш ранніх крыніцах – Хроніцы Быхаўца і хроніцы М. Стрыйкоўскага – прама гаворыцца пра тое, што Міндоўг хрысціўся ў каталіцтва [13, с. 132–133; 21, s. 289]. Такім чынам, да інфармацыі, якая выкладзена аўтарам Густынскага летапіса, ёсць цэлы шэраг прэтэнзій. Па-першае, яна паходзіць з вельмі позняй і пры гэтым тэндэнцыйнай кампіляцыі. Па-другое, яна супярэчыць іншым, больш раннім і больш аўтарытэтным крыніцам. І, нарэшце, мае ўнутраную супярэчнасць: навошта язычніку-Міндоўгу было пераходзіць у праваслаўе, каб потым прыняць каралеўскую карону з рук папскага легата? Усё гэта прымушае глядзець на версію Густынскага летапіса выключна як на гістарыяграфічную канструкцыю аўтара XVII ст., прычым не вельмі ўдалую, якая не мае ніякай каштоўнасці як гістарычная крыніца.

Апошнія мадыфікацыі ў легенду ўнёс Мікола Ермаловіч. Ён не толькі рэанімаваў яе ў канцы XX ст., але і дапоўніў некаторымі новымі падзеямі і рысамі, якія надалі ёй новую афарбоўку. У сваіх пабудовах даследчык грунтаваўся ўжо не столькі на пачатковым Летапісцы Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага, колькі на познім Густынскім летапісе. Так, напрыклад, М. Ермаловіч вельмі настойліва праводзіў думку пра тое, што ў ходзе барацьбы за ўладу Міндоўг спачатку быў вымушаны ўцякаць з Літвы, разбіты сваімі палітычнымі праціўнікамі,

потым прыбег у Навагрудак, дзе быў прыняты на княжанне, і, нарэшце, разам з мясцовымі баярамі заваяваў сваю радзіму. Ці, дакладней, заваяванне Літвы "новагародскія феадалы ажыццявілі сваімі сіламі пры дапамозе перабежчыка … Міндоўга" [5, с. 63; 4, с. 70]. Але ніводная крыніца, у тым ліку Густынскі летапіс, нічога не паведамляе ні пра ўцёкі вялікага князя літоўскага з Літвы, ні пра яго княжанне ў Навагрудку, ні пра далейшае заваяванне Міндоўгам Літвы пры падтрымцы навагрудскіх баяраў. Усё гэта выключна інтэрпрэтацыі М. Ермаловіча. Разам з тым, версія пра сталічны статус Навагрудка вельмі добра ўпісвалася ў яго шырэйшую гістарыяграфічную канцэпцыю "Вялікае Княства Літоўскае – беларуская дзяржава". Сапраўды – дзе, як не на беларускіх землях, павінна была знаходзіцца сталіца беларускай дзяржавы?

Такім чынам, легенда пра тое, што Навагрудак быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, не знаходзіць пацвярджэння ў крыніцах, сінхронных эпосе, калі адбывалася станаўленне гэтай дзяржавы. Яна з'явілася значна пазней – першыя яе сляды мы знаходзім толькі ў беларуска-літоўскіх летапісах 20-х гг. XVI ст. На працягу наступных 150 гадоў, і ў многім дзякуючы ўжо друкаваным выданням, легенда набыла папулярнасць і прызнанне сярод знаўцаў і аматараў гісторыі. Крытычная гістарыяграфія XIX – XX стст., якая спачатку разглядала сталічны статус Навагрудка як гістарычны факт, паступова адмовілася ад гэтай ідэі. Легенда зноў набыла папулярнасць у канцы XX ст., што было звязана з кардынальным змяненнем статусу Беларусі, яе пераўтварэннем у незалежную дзяржаву. У новым поглядзе на нацыянальную гісторыю стары міф зноў аказаўся зручным і запатрабаваным.

Той факт, што Навагрудак стаў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага толькі дзякуючы міфатворчасці аўтараў XVI – XVII стст., зусім не адмаўляе таго, што гэты горад сапраўды меў вельмі высокі статус у дзяржаве. Ёсць падставы лічыць, што акурат у час стварэння легенды Навагрудак разам са сваёй зямлёй займаў у іерархіі рэгіёнаў Вялікага Княства Літоўскага трэцяе месца – непасрэдна пасля Вільні і Трокаў з аднайменнымі ваяводствамі. Так, у апісанні цырымоніі ўзвядзення каралевіча Жыгімонта Аўгуста на трон Вялікага Княства ў 1529 г. сказана, што навагрудскі ваявода заняў месца «на леве маистату», непасрэдна пасля віленскіх і троцкіх ваяводаў і кашцялянаў [14, с. 235]. Зусім не выключана, што гэта трэцяе месца і магло падштурхнуць аўтараў легенды да думкі пра тое, што такі высокі статус Навагрудка менавіта тым і тлумачыцца, што калісьці горад быў першай сталіцай дзяржавы. Зыходзячы з сённяшніх ведаў, мы павінны сфармуляваць гэта дакладней: яе першай легендарнай сталіцай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Александров, Д.Н., Володихин, Д.М. Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII – XVI веках. – Москва: "Аванта+", 1994. – 134 с.

2. Александров, Д.Н. Феодальная раздробленность Руси. – Москва: Экслибрис-Пресс, 2001. – 480 с.

3. Баранаускас, Т. Новогрудок в XIII в.: история и миф // Castrum, Urbis et Bellum. – Баранавічы: РУПП "Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня", 2002. – С. 29–44.

4. Ермаловіч, М.І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – Мінск: "Беллітфонд", 2000. – 448 с.

5. Ермаловіч, М.І. Па слядах аднаго міфа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 94 с.

6. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – 4-е выд. – Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 176 с.

7. Кириченко, К.В. Методи роботи укладачів леґендарної частини літописів Великого Князівства Литовського: на прикладі запозичень із тексту Іпатіївського літопису // Український історичний журнал. – 2014. – № 2. – С. 177–203.

8. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Вільня: Друкарня Марціна Кухты, 1910. – IV+104 с.

9. Любавский, М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства. – Москва: Университетск. типогр., 1892. – VIII+884+C+VI с.

10. Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. – 2-е изд. – Москва: Московск. худож. печатня, 1915. – [IV]+401+III с.

11. Полное собрание русских летописей. – Т. 2: Ипатьевская летопись / Гл. ред. Я.И. Бередников. – [1-е изд.] – Санкт-Петербург: Типогр. Э. Праца, 1843. – IX+381 с.

12. Полное собрание русских летописей. – Т. 2: Ипатьевская летопись / Подг. к изд. А.А. Шахматов. – 2-е изд. – Санкт-Петербург: Типогр. М.А. Александрова, 1908. – XVI+938+ 87+IV с.

13. Полное собрание русских летописей. Т. 32: Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца; Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / Подг. к изд. Н.Н. Улащик и В.А. Чемерицкий. – Москва: Наука, 1975. – 234 с.

14. Полное собрание русских летописей. Т. 35: Летописи белорусско-литовские / Подг. к изд. Н.Н. Улащик и В.А. Чемерицкий. – Москва: Наука, 1980. – 307 с.

15. Полное собрание русских летописей. Т. 40: Густынская летопись / Подг. к изд. Ю.В. Анхимюк, С.В. Завадская, О.В. Новохатко и А.И. Плигузов. – Санкт-Петербург: «Дмитрий Буланин», 2003. – 202 с.

16. Пресняков, А.Е. Лекции по русской истории. Т. 2. Вып. 1: Западная Русь и Литовско-Русское государство. – Москва: Гос. соц.-эк. изд-во, 1939. – 247 с.

17. Русина, О. В. Україна під татарами і Литвою. – Київ: "Альтернативи", 1998. – 320 с.

18. Gwagnin, A. Kronika Sarmacji Europskiej. – Kraków: Drukarnia Mikołaja Loba, 1611. – Księga 2: Kronika W. X. Litewskiego. – S. 1–120.

19. Ochmański, J. Nad Kroniką Bychowca // Studia Źródłoznawcze. – T. 12. – 1967. – S. 155–163.

20. Pociecha, W. Królowa Bona (1494 – 1557): czasy i ludzie Odrodzenia. T. 2. – Poznań: Poznańskie Towarzystwo Przyjaciół Nauk, 1949. – 598 s.

21. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi. T. 1. – Warszawa: Nakład G.L. Glücksberga, 1846. – XLVIII+63+392 s.

22. Wijuk Kojałowicz, A. Historiae Litvanae pars prior, de rebus Litvanorum ante susceptam Christianam religionem conjunctionemque Magni Litvaniae Ducatus cum Regno Poloniae. – Dantisci: Sumptibus Georgii Försteri, 1650. – [12]+399 p.

## ДЫНАСТЫЯ СВЯТЫХ: ПРАЕКТЫ СТВАРЭННЯ КУЛЬТУ СВЯТОГА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XIII – XVI СТ.

**А. Ул. Любы**

Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, liuby@list.ru

Аўтар раскрывае, чаму не ўдалося рэалізаваць праект кананізацыі Казіміра і паказаць перавагу «дынастыі святых» над супернікамі як на праваслаўным усходзе, так і пратэстанцкай поўначы. З аднаго боку Казімір быў патронам царквы ў Рэчы Паспалітай, існавала народная